*АЛЕНА ПАЎЛАВА*

# ПРА ПАЛЕСКАЕ ВЯСЕЛЛЕ З ЛЮБОЎЮ

Клімчук Ф. Д. Традыцыйнае вяселле вёскі Сіманавічы Драгічынскага раёна Брэсцкай вобласці: этналінгвіст. зборн. Мінск: Мэджык. 2011. – 84 с.

Гэта невялікая па аб'ёме, але надзвычай багатая па змесце кніга, мае патрэбу ў асобым прадстаўленні, паколькі сабраныя ў ёй беларускія вясельныя песні надта поўна і ўсебакова адлюстроўваюць абрадавыя традыцыі, якія існавалі паўсюль у вёсках Брэсцкай вобласці ў мінулым стагоддзі, а дзесь працягваюць сваё існаванне і цяпер. Аснову кнігі складаюць апісанні рытуальных дзеянняў, якія адбываліся напярэдадні, а таксама ў розныя дні вяселля. Кожны абрад выдатна ілюстраваны тэкстамі абрадавых песень. Акрамя этнаграфічных звестак, у кнізе прадстаўлена вялікая колькасць песень. Вельмі падрабязна раскрываецца кожны дзень абраду вяселля, прыводзяцца ўсе сабраныя аўтарам звесткі ў адносінах да гэтага шматдзённага свята.

Першая глава мае назву «Заручыны. Дзявочнік». Тут аўтар апісвае рытуальныя дзеянні, а таксама паведамляе шмат цікавых і малазнаёмых падрабязнасцяў, што датычыліся выканання гэтага абраду на вёсцы, напрыклад: «*Запойіны пачынаюцьця ввэчыры, а роз'їжджяюцьця вжэ пуд ранок...*» (с. 7). Падрабязна ў кнізе гаворыцца пра падрыхтоўку да вяселля, якое заўсёды ладзілі бацькі маладых. Пад вечар напярэдадні свята сяброўкі нявесты рабілі для яе вянок, дарылі ёй свае стужкі. Маладому прымацоўвалі да грудзей кветку, раней жа яе чаплялі да шапкі.

Згодна з традыцыяй, жаніх павінен быў выкупіць вянок для сваёй нарачонай: «*дывкы торгуюцьця за вынка. Жыных скупляе вынка: ставыть дывчатюм "за работу" горілку*» (с. 17); *да свята маладая выносіць вянок на талерцы ў камору і хавае ў скрыню*» (с. 17). Не менш цікавая заўвага даецца на старонках кнігі пра ўдавіцу, якой не робяць вянок на вяселле (с. 18).

Другая глава называецца «Першы дзень вяселля». Тут таксама даволі поўна і падрабязна разглядаюцца ўсе падзеі пачатку вяселля: «*Як до цэрквы йіхалы і назад, то молодуха, і дружка, і молодый всім кланяйіцьця, кого судосеть, хто йдэ чы йідэ*» (с. 21). Трэба адзначыць, што кожная абрадавая дзея падчас вяселля суправаджаецца выкананнем адпаведных песень.

Трэцяя глава кнігі прысвечана падрабязнаму апісанню падзей, якія павінны адбывацца на другі дзень вяселля, калі радня жаніха едзе да маладой, і мае адпаведную назву – «Другі дзень вяселля». Глава чацвёртая, прысвечаная прыезду радні маладой да бацькі маладога, называецца «Трэці дзень вяселля». Таксама гучаць песні, жарты. Пятая, апошняя глава, распавядае пра чацвёрты дзень вяселля. Зранку радня жаніха збіраецца ў яго бацькі, а родныя нявесты – у яе хаце. Госці частуюцца, спяваюць песні. У гэты час дружка абыходзіць кожнага госця і бярэ падарунак маладым, так званую «бонду». Бонду давалі ўсякую: «*...корову, овэчку, телку, порося, тыля, як хто, то курыцю, гусь...*» ( с. 79 ).

Дзякуючы багаццю і высокай якасці матэрыялаў, сабраных аўтарам, выданне, падрыхтаванае ім з вялікай пашанай і глыбокай любоўю да продкаў, безумоўна, павінна заняць дастойнае месца сярод іншых работ аб духоўнай культуры беларусаў.

Асабліва неабходна адзначыць імкненне Ф. Клімчука як мага больш поўна і дакладна перадаць мясцовую гаворку. Аўтар піша менавіта так, як ён чуе словы інфарматара, і гэта робіць яго кнігу сапраўднай крыніцай для вывучэння мясцовага дыялекту.

Важнай станоўчай асаблівасцю кнігі Ф. Клімчука з'яўляецца паслядоўная сістэматызацыя выкладзенага ў ёй матэрыялу. Для таго каб чытач меў поўнае і дастатковае ўяўленне аб мясцовым фальклоры, аўтар даволі падрабязна апісвае словы і дзеянні кожнай дзеючай асобы вяселля: дружкі, свата, сваццi, сяброўак маладой, бацькоў жаніха і нявесты. Кніга Ф. Клімчука прапануе задумацца над праблемамі, якія існуюць сёння ў абрадавай культуры беларусаў, над метадамі збору фальклорнага матэрыялу, а таксама над самім паняццем «беларуская народная культура». Надзвычай добрая кніга таленавітага аўтара будзе карысна для кожнага, хто мае цікавасць да беларускай традыцыйнай культуры.

Хочацца пажадаць Ф. Клімчуку доўгай і паспяховай працы на спрыяльнай ніве айчыннага фальклору.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ